Касцёл у Казловічах: да 100-годдзя вяртання святыні

Аўтар: Андрэй Грэсь
16.05.2021 00:00

Казловіцкі парафіяльны касцёл, як і многія святыні Беларусі, мае нялёгкую гісторыю. За сценак Казловічы, як і суседні маёнтак Верцялішкі, у сярэдзіне XIX стагоддзя былі ва ўладанні двараніна, афіцэра царскай арміі Аляксандара Свечына. У 1843 годзе яго жонкай Аляксандрай са старажытнага нямецкага роду Біспінгаў быў куплены хутар Казловічы, далучаны да іх вялікага валодання ў Верцялішках.

З канца XVIII стагоддзя ў Казловічах існавала невялікая драўляная грэка-каталіцкая царква. З інвентара апісання парафіян казловіцкай царквы за 1824 год вынікае, што да яе належалі 341 вернік з вёсак Табала і Сколабава і невялікая частка са шляхецкіх ваколіц Эйсманты, Аленічы і Казловічы. У захаваных метрыкальных кнігах можна знайсці запісы аб ваколічнай шляхце: Быльчынскіх, Чарняўскіх, Давідовічах, Эйсмантах, Гарбачэўскіх, Камінскіх, Кучынскіх, Мінючыцах, Станкевічах, Струпінскіх, Талочках і інш. Адсюль вынікае, што парафіяне дзяліліся на простых прыгонных сялян і мясцовую шляхту, частка якой яшчэ заставалася ўніяцкай, а часам была рымска-каталіцкай, але працягвала наведваць уніяцкую святыню. † Пасля ліквідацыі уніі ў 1839 годзе новыя праваслаўныя вернікі былі далучаны да прыхода ў Верцялішках, а вернікі рымска-каталіцкага веравызнання – да парафіі ў Азёрах. Былая грэка-каталіцкая царква стала капліцай азёрскай парафіі. Каталічка Аляксандра Біспінг грунтоўна адрамантавала капліцу ў канцы 50-х гадоў XIX стагоддзя.

Пасля паўстання 1863 года капліцу ў Казловічах перадалі праваслаўным. У 1915 годзе гэтыя землі былі заняты немцамі, і ў былой уніяцкай царкве пачалі спраўляць Імшы, а ў 1920 годзе вернікі і мясцовыя ўлады загаварылі аб афіцыйнай рэвіндыкацыі (вяртанні) святыні католікам. Гэтаму спрыялі і вернікі былой казловіцкай грэка-каталіцкай парафіі, якія складалі найбагацейшую частку ваколічнай шляхты і з якімі вымушаны быў лічыцца азёрскі пробашч кс. Куксевіч, якому спачатку не вельмі падабалася перспектыва выдзялення з Азёр новай парафіі. У 1920 годзе касцёл у Казловічах быў пераасвечаны пад падвойным тытулам – Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і св. Андрэя Баболі, мучаніка. Адзін з бакавых алтароў касцёла прысвечаны пакутніцкай смерці гэтага святога, празванага за сваю місіянерскую дзейнасць Апосталам Палесся.

Аўтар: Андрэй Грэсь
16.05.2021 00:00



[redacted]